**Л. М. Мазуркевіч** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

# АДМЕТНАСЦІ СЛОВАЎЖЫВАННЯ НАЙМЕННЯЎ СА ЗНАЧЭННЕМ ‘ЗУБ’ У ГАВОРКАХ УСХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

У межах выяўленых ва ўсходнепалескіх гаворках прадметна-тэматычных груп саматызмаў адметнае месца займае адносна невялікая ў колькасным выражэнні мікрагрупа, аб’яднаная значэннем ‘формы і тыпы зубоў’. Назоўнікам *зуб* (< прасл. zǫbъ – [5, т. 3, с. 347]), што супадае з тэрміналагічным найменнем [1, с. 460], абазначаецца касцявое ўтварэнне, орган у роце для адкусвання і разжоўвання ежы: *От зубу мне боляць (Дзвіжкі Ельск.)*.

Унутраная частка зуба, якая знаходзіцца ў дзясне, абазначаецца словам *корэнь* (< прасл. korьnь – [5, т. 5, с. 99]): *Корэнь седзіць, а посерэдзіне зуб перэломаўса (Пагост Жытк.)* і ў форме *корань* супадае з лексічнай нормай сучаснай беларускай мовы [1, с. 297]. У якасці сінанімічнай назвы да пазначанай намінатыўнай адзінкі ва ўсходнепалескіх гаворках засведчана выкарыстанне наймення *пень*: *Зубы плахіе, мо чатыры пні трэба рваць (Дзяражычы Лоеўск.)*, якое ўзнікла ў выніку пераносу назвы (*пень* – ‘астатак зуба, які тырчыць з дзясны’). Для параўнання – адно са значэнняў да слова *пень*, што фіксуецца нарматыўнымі слоўнікамі беларускай мовы, – ‘астатак спілаванага, ссечанага ці зламанага дрэва, які тырчыць з зямлі’ [1, с. 460].

Асобныя зубы ў народна-дыялектнай мове атрымалі пэўныя назвы паводле сваёй формы, месца размяшчэння ў роце і інш. Так, словам *молочнікі* (< малако) абазначаюцца зубы ў дзяцей, якія выпадаюць пасля шасцігадовага ўзросту: *У яго молочнікі позна вураслі (Ручаёўка Лоеўск.)*.

Для наймення верхніх пярэдніх парных зубоў плоскай формы выкарыстоўваюцца словы-сінонімы тыпу *верхоўе* (< прасл. vьrхъ – [3, т. 1, с. 302]), *прыку́сы*(< пры- + кусаць), *перэдніе* (< перад), *рэ́зцы*(< рэзаць): *Установіла собе верхоўе і жыву (М. Малешава Жытк.)*; *Ты прыку́самі кусай (Ручаёўка Лоеўск.)*; *Перэдніе зубы спорчаные (Загорыны Мазыр.)*; *Свое рэ́зцы я ўжэ поз’едала (Грышы Ельск.)*.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Саматызм *ікла /ікол/* (< прасл. kъlъ – [5, т. 5, с. 375–376]) абазначае зуб, які знаходзіцца непасрэдна за разцамі: *Ікла вурэзваюцца, так ён канозіцца (Грабаў Петрык.); Недобры ікол расце, крыві (Будкі Нараўл.)*.

Зуб, што з’яўляецца наступным пасля іклоў, мае назву *клык* (< прасл. klykъ – [5, т. 5, с. 70]): *Клыкі доўгіе повуросталі (Карма Ельск.)*. Акрамя таго, у тураўскіх гаворках засведчана сінанімічнае ўтварэнне *балясы*: *Балясы вушчэрыў (Запясочча Жытк.)*, якое ўжыта ў пераносным значэнні і стала метафарай да слова *баляса*, паколькі *балясай* прынята называць точаны фігурны слупок у агароджы балконаў, тэрас і інш. [1, с. 81]. Этымолагі мяркуюць, што назоўнік першапачаткова ўжываўся ў сэнсе ‘рэдкія зубы’ (падобныя да агароджы) [5, т. 1, с. 299].

Двухкампанентнае ўтварэнне *кутні зуб* (< кут – [5, т. 5, с. 174]) служыць для наймення карэннага зуба: *Сам ты кутні зуб не вурвеш (Баравое Лельч.)*. Паралельна з ім у даследуемых гаворках фіксуецца ўжыванне слоў *бакавы, кутнік, цеменны* [4, с. 190], што матывуюцца назоўнікамі і выразна ўказваюць на месца размяшчэння зуба ў ротавай поласці.

Асобныя з разгледжаных саматычных назваў: *ікол, карэнны зуб* / *кутні зуб* /, *клык* (з паметай *абласное*), *малочныя зубы*, *разец* – фіксуюцца нарматыўнымі слоўнікамі сучаснай беларускай мовы [1, с. 253, 294, 331, 542; 2, т. 2, с. 517] і гаворкамі іншых дыялектных зон Беларусі [4, с. 190].

Такім чынам, акрэсленыя намінатыўныя адзінкі, што функцыянуюць у народна-дыялектнай мове жыхароў усходнепалескага рэгіёна для абазначэння зубоў, уяўляюць сабой фанетычныя ці словаўтваральныя варыянты кадыфікаваных найменняў або, увогуле, з’яўляюцца вузкарэгіянальнымі ўтварэннямі.

**Літаратура**


1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск: БелЭн, 1999. – 784 с.
2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы). – Мінск: БелСЭ, 1977–1984. – Т. 2.
3. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: в 4 т. / М. Фасмер. – М.: Прогресс, 1986–1987. – Т. 1.
4. Чалавек: тэматычны слоўнік / склад. В. Дз. Астрэйка [і інш.]; навук. рэд. Л. П. Кунцэвіч, А. А. Крывіцкі. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – С. 190.
5. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы: у 11 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978–2006. – Т. 1, 3, 5.


МГПУ им. И.П. Шамякина